## ДА ЧЫТАЧА

Гісторыя Чашніцкай зямлі вельмі старажытная. З даўніх часоў жывуць на ёй людзі. Менавіта тут перакрыжоўваліся ваенныя і гандлёвыя шляхі, якія вялі з Віцебска на Мінск і з Полацка на Магілёў. У мінулыя часы Чашнікі лічыліся важным стратэгічным пунктам.

Адметнай рысай, характэрнай толькі для Чашніцкай зямлі, з'яўляецца існаванне на ёй у мінулым двух старажытных княстваў — Лукомскага і Чарэйскага. Гісторыі гэтых княстваў — цікавыя старонкі гісторыі Беларусі.

Шмат людзей і паселішчаў гінула ў часы войнаў, шмат бітваў адбылося на Чашніцкай зямлі. Зямля раёна густа паліта крывёю. Але ўсе значныя бітвы, што тут адбываліся, былі пераможнымі для воінства нашай дзяржавы.

1112

Увасобіць гістарычныя падзеі мінулага, уваскрэсіць памяць аб гераізме чашнічан, аб загінуўшых людзях, спаленых вёсках, знікшых паселішчах, аб знакамітых земляках — такая мэта стаяла пры стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Чашніцкі раён». Пры напісанні хронікі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных архіваў Віцебскай і Магілёўскай абласцей, Чашніцкага аддзела запісу грамадзянскага стану і аддзела статыстыкі, публікацыі раённай, абласной і рэспубліканскіх газет. Былі выкарыстаны сотні кніг і часопісаў, асобныя публікацыі, энцыклапедычныя выданні.

Вялікую дапамогу ў выданні кнігі аказалі супрацоўнікі музеяў, архіваў, бібліятэк, работнікі органаў мясцовай улады і Чашніцкага раённага гістарычнага музея, грамадскасць раёна, супрацоўнікі арганізацыйна-метадычнага Цэнтра па выданні Хронік Памяці, выдавецтва «Беларуская навука».

Хроніка «Памяць. Чашніцкі раён» перад вамі, паважаны чытач. Хай жа не згасае памяць у сэрцах і вялікая любоў да роднага краю!

Чашникская ЦБС
Витебской обл.